# Усебеларуская канфэрэнцыя „Маладняка“

16-га лютага ў клюбе КІМ адкрылася канфэрэнцыя групы «Маладняк». Вітаў канфэрэнцыю ад ЦК КП(б)Б тав. Сянкевіч.

З дакладам аб становішчы «Маладняка» выступіў тав. Галавач. Ён у кароткіх словах ахарактарызаваў становішча групы з першых дзён яе існаваньня да сучаснага моманту. З дакладам аб беларускай літаратуры выступіў тав. Сянкевіч.

## Сучасная беларуская літаратура

—Калі мы азіраемся на той шлях, які пройдзен «Маладняком», то мы ня можам ня спыніцца на тэй барацьбе, якую «Маладняк» правёў з старымі пісьменьнікамі-адраджэнцамі.

Кастрычнік зьдзейсьніў імкненьне працоўных мас Беларусі—яны дамагліся нацыянальна-сацыяльнага вызваленьня. Ня гледзячы на гэта, традыцыі адраджанізму жылі ў галовах значнай часткі беларускай інтэлігенцыі, а разам з гэтым і ў беларускіх песьняроў. Адраджанізм ня толькі перастаў быць перадавой ідэяй, ён стаў ідэяй рэакцыі. Адгэтуль пачынаецца барацьба з адраджанізмам і ў жыцьці, і ў літаратуры.

І трэба сказаць, што гэту падвойную задачу, задачу замацаваньня заваёў Кастрычніка, з аднаго боку, і падштурхваньня старых пісьменьнікаў да пераходу на новыя рэйкі, з другога боку, «Маладняк» выканаў. «Маладняк» пачынае займаць усё большае месца як у літаратуры, так і ў грамадзкім жыцьці, ён выкоўвае дзесяткі таленавітых мастакоў слова, вакол «Маладняка» згуртоўваюцца сотні вучнёўскай і селькораўскай моладзі, ён шырока адчыняе дзьверы маладым сілам з рабочых і сялянскіх колаў.

Мы былі сьведкамі, калі ад «Маладняка» ў працэсе росту адкалолася група пісьменьнікаў, якая утварыла новую арганізацыю—«Узвышша».

Што прадстаўляе сабою «Ўзвышша» наогул, ідэалёгію якіх груп або клясы яно выяўляе? Па маёй думцы, «Ўзвышша» ў сваёй большасьці выяўляе ідэалёгію нашага сялянства і тых пластоў савецкай інтэлігенцыі, якія цесна зьвязаны з сялянствам. І нельга наогул глядзець на «Ўзвышша», як на варожую нам групу. Мы павінны мець да яе адносіны, як і да тае інтэлігенцыі, якая яшчэ ня ўсім прасякнута пралетарскай ідэалёгіяй, але стаіць на нашай савецкай плятформе і шчыра з намі працуе. Аб тым, што асноўная група пісьменьнікаў зьяўляецца сялянскай групай, гаворыць і мастацкая творчасьць «Узвышша». Тая-ж няўпэўненасьць у настроях—скок ад настрыманага аптымізму да самага глыбокага пэсымізму, часам супроцьстаўленьне вёскі гораду, выяўленьне некаторымі адзінкамі «Ўзвышша» кулацкіх настрояў. З гэтымі кулацкімі настроямі трэба весьці рашучую барацьбу.

Што-ж датычыць наогул адносін да «Ўзвышша» і ўзвышаўцаў, дык яны павінны быць таварыскімі. Ня шляхам асабовага або групавога падходу, а шляхам здаровай крытыкі мы павінны дапамагаць іх пераходу на рэйкі пралетарскай ідэалёгіі.

У апошнія часы літаратурнае жыцьцё абагацілася яшчэ дзьвюма групамі: «Полымя» і «Літаратурная Камуна». «Полымя» зьяўляецца аб'яднаньнем старых «нашаніўцаў» і групы былых «маладнякоўцаў». Пераход такіх таварышоў, як Чарот, Зарэцкі, тлумачыцца тым, што яны пры агульнай правільнай лініі, занятыя іншай працай, не маглі аддаць кіраваньню «Маладняком» і часу, і ўвагі, а адказнасьць за ўсё тое, што рабілася ў «Маладняку», клалася на іх. Паколькі нашы волаты літаратуры ў значнай меры пазбылі свае адраджэнцкія ілюзіі, пастолькі гэтае аб'яднаньне часткі маладнякоўцаў з старымі зьяўляецца станоўчым фактам у нашым літаратурным жыцьці. «Полымя» па сваёй ідэалёгіі зьяўляецца найбольш блізкай групай да «Маладняка».

Літаратурная група «Камуна»—арганізацыя маладая, выпусьціла першы нумар часопісі—імкнецца да будаваньня літаратуры, выходзячы з палажэньня, што мастацтва зьяўляецца ня толькі жыцьцёразуменьнем, але і жыцьцебудаўніцтвам, ідзе пад лёзунгам разваленьня мовы. Як справіцца група з пастаўленымі задачамі, пабачым далей.

Урэшце, спынімся на «Маладняку». Ня гледзячы на цяжкі крызіс, «Маладняк» у асноўным усё-ж зьяўляецца моцнай арганізацыяй. Тыя сprэчкі, якія тут адбыліся, паказалі, што ёсьць шмат і хворага і гэта зразумела у нашых умовах дробнабуржуазнага абкружэньня пры амаль поўнай адсутнасьці выхаваўчай працы. Але ўсё-ж мы павінны сказаць, што асноўнае ядро «Маладняка» здаровае, пралетарскае. Маладнякоўцы павінны працаваць над сабою, працаваць над сваім выхаваньнем наогул, над мастацкай адшліфоўкай сваіх твораў. Маладнякоўцы павінны даць сапраўдную мастацкую творчасьць, павінны сур'ёзна ўзяцца за працу.